# ТРАНЗІТАЛОГІЯ: ПРАЕКТ І ДЫСЦЫПЛІНА

© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
(ISSN 1819-3625) №3 (2004) стр.54-56

*Размова з Уладзімірам Гельманам*
*(Санкт-Пецярбург, Расія)*

*Уладзімір Гельман нарадзіўся ў 1965 г. Кандыдат палітычных навук. З 1996 г. — дацэнт факультэта палітычных навук і сацыялогіі Еўрапейскага універсітэта ў Санкт-Пецярбургу. Сябра рэдакцыйных калегіяў часопісаў «Поліс», «European Political Science», «International Journal of Urban and Regional Research». Аўтар альбо рэдактар 14 кніг па праблемах сучаснай расійскай палітыкі.*

**— Спадар Гельман, як Вы лічыце, чым ёсць транзіталогія, якая ейная праблематыка, прадмет даследавання і мэты?**

— На мой погляд, тэрмін «транзіталогіі» ў постсавецкім (і не толькі) навуковым дыскурсе атрымаў неабгрунтавана высокі статус. У шырокім сэнсе, можна казаць пра даследаванні працэсаў змены палітычных рэжымаў, якія ўключаюць у сябе вялізны масіў літаратуры, — і не толькі сучаснай, але і класічнай (дастаткова прыгадаць «Стары рэжым і рэвалюцыя» Алексіса дэ Таквіля альбо «18 брумэра Луі Банапарта» Карла Маркса). У такім разуменні любыя змены палітычных рэжымаў могуць быць разгледжаныя як «транзіт». Аднак у больш вузкім сэнсе пад «транзіталогіяй» прынята разумець толькі адзін з напрамкаў у гэтым масіве даследаванняў, які бярэ на ўлік, перш за ўсё, не столькі аб’ектыўныя («структурныя») перадумовы для гэткіх зменаў, колькі суб’ектыўныя аспекты, звязаныя з роляй палітычных актораў. Так атрымалася, што напрыканцы 1980-х — на пачатку 1990-х гг. менавіта гэтая плыня апынулася запатрабаванай у палітычным плане і моднай у акадэмічным аспекце. Сёння гэтая мода ўжо адышла, хоць даследаванні змены рэжымаў (у тым ліку выкананыя ў межах «транзіталагічнай» плыні) працягваюцца і будуць працягвацца. Мэты гэтых даследаванняў відавочныя: высвятліць заканамернасці змены палітычных рэжымаў і фактары, якія ўплываюць на гэтыя працэсы і вызначаюць іх вынікі. Самі гэтыя заканамернасці і з’яўляюцца прадметам даследавання.

**— Як, на Вашую думку, выглядае гісторыя транзіталогіі як сферы даследавання і парадыгмы? Якая ейная метадалагічная эвалюцыя, як развівалася праблематыка, як змяняліся акцэнты?**

— У шырокім плане гісторыя вывучэння змены рэжымаў ёсць гісторыяй палітычнай навукі як такой, з усімі ейнымі парадыгмамі, метадалогіяй і методыкамі — ад простага апісання да тэорыі гульняў. Калі ж казаць пра вузкі «транзіталагічны» накірунак, то ягоныя межы вызначаюцца перыядам канца 1980-х — пачатку 2000 гг. У агульных рысах падыход «транзіталогіі» быў закладзены ў калектыўнай манаграфіі «Пераход ад аўтарытарнага праўлення»[1] (1996) пад рэдакцыяй Філіпа Шмітэра, Гільерма О’Донэла і Лоўрэнса Вайтхэда. Уласна кажучы, менавіта Шмітэру і належыць аўтарства пазнейшага тэрміну «транзіталогія». Рысу ж пад развіццём гэтага накірунку падвёў артыкул Томаса Карозэрса «Канец парадыгмы транзіту»[2], апублікаваны ў часопісе «Journal of Democracy». З’яўленне гэтага падыходу, якому было наканавана растлумачыць крушэнне аўтарытарных рэжымаў і паўстанне дэмакратыяў у Паўднёвай Еўропе і Лацінскай Амерыцы ў 1970–80-я гг, супала па часе з заняпадам камуністычных рэжымаў ва Усходняй Еўропе і былым Савецкім Саюзе. Гэта абумовіла вялікую зацікаўленасць да гэтага падыходу як у палітычных колах, так і ў даследчыцкіх асяродках — сярод найбольш значных працаў тут трэба назваць такія, як «Трэцяя хва-

[1] Guillermo O’Donnell, Philippe Schmitter, and Lawrence Whitehead “Transitions from Authoritarian Rule” (Johns Hopkins University Press, 1986) (тут і надалей — спасылкі Рэдактара).

[2] Thomas Carothers “The End of the Transition Paradigm” in Journal of Democracy, 2002, vol. 13, N 1.

ля» Сэмюэла Хангтынтана[3] і «Дэмакратыя і рынак» Адама Пшэворскага[4] (абедзве — 1991).

У сярэдзіне 1990-х гг., аднак, зрабілася відавочным, што «транзіталогія» мае шэраг істотных недахопаў. Яе крытыкавалі за тэлеалагізм (прадметам аналізу быў у асноўным разгляд варыянтаў пераходу да дэмакратыі, без уліку іншых магчымых сцэнараў развіцця падзеяў пераходу), за недастатковы ўлік структурных фактараў змены рэжымаў, за недастатковы ўлік комплекснага характару змены рэжымаў (уключна з уплывам магчымага адначасовага правядзення эканамічных рэформаў, працэсамі змены межаў і асаблівасцямі дзяржаўнага будаўніцтва ў шэрагу посткамуністычных краінаў) і г. д.

З завяршэньнем на пачатку 2000-х гг. працэсу змены палітычных рэжымаў у большасці краінаў Усходняй Еўропы і былога Савецкага Саюза практычная актуальнасць транзіталогіі была вычарпаная. На змену гэтаму накірунку зараз прыходзяць іншыя падыходы, якія спрабуюць растлумачыць сучасныя вынікі змены рэжымаў з улікам дасягненняў і паразаў даследаванняў, зробленых у папярэднія паўтара дзесяцігоддзі. Калі ж казаць пра метадалогію, то тут можна звярнуць увагу на пераход ад асобных апісальных даследаванняў канкрэтных выпадкаў змены рэжымаў у канкрэтных краінах да шырокага крос-нацыянальнага і крос-рэгіянальнага параўнання (у тым ліку і крос-тэмпаральнага), а таксама да пабудовы фармальных мадэляў дэмакратызацыі і/альбо знішчэння дэмакратыяў. Але ў гэтым сэнсе «транзіталогія» не ўнікальная, яе развіццё адбывалася ў рэчышчы агульных тэндэнцыяў палітычнай навукі.

**— Якія сувязі назіраюцца паміж тэорыяй мадэрнізацыі і транзіталогіяй?**

— «Транзіталогію» ў вузкім значэнні гэтага тэрміну можна разглядаць як адгалінаванне ад тэорыі мадэрнізацыі, толькі з той заўвагай, што яна робіць акцэнт не на сістэмныя фактары (эканамічнае развіццё, сацыяльная структура, культура), а на дзеянні тых альбо іншых актораў. Але прынцыповых падабенстваў паміж транзіталогіяй і тэорыяй мадэрнізацыі значна больш, чым прынцыповых адрозненняў. У гэтым палягаюць як плюсы, так і мінусы транзіталогіі.

**— На Ваш погляд, ці мела заходняя транзіталогія, калі яе разглядаць як дыскурс, нейкі выразны ідэалагічны базіс? Наколькі ейнае развіццё звязанае з канкрэтнымі праектамі палітычнай і эканамічнай трансфармацыі ўсходнееўрапейскага рэгіёну?**

Калі разглядаць дэмакратызацыю як такога кшталту ідэалогію, то сапраўды тут можна казаць пра пэўны ідэалагічны ўхіл. Але пры гэтым трэба мець на ўвазе, што ў сусветнай навуковай супольнасці сярод палітолагаў існуе нарматыўны кансэнсус адносна прызнання неабходнасці дэмакратычнага рэжыму як падмурку сучаснага палітычнага ладу — асобаў, якія б не падзялялі гэты тэзіс, у навуковай супольнасці не знайсці. Што ж датычыцца канкрэтных праектаў трансфармацыі, то шмат якія высновы «транзіталогіі» выкарыстоўваліся ў распрацоўках і рэкамендацыях разнастайных заходніх урадаў, міжнародных і няўрадавых арганізацыяў, якія дапамагалі ў пабудове новых дэмакратыяў, у тым ліку і ва Усходняй Еўропе. Але эфектыўнасць гэтай дапамогі адмыслоўцы, у тым ліку і Карозэрс, на артыкул якога я спасылаўся, ацэньваюць невысока. На мой погляд, уплыў «транзіталогіі», як і палітычнай навукі ўвогуле, на палітычную практыку быў неістотны.

**— Як бы Вы вызначылі корпус найбольш значных канцэпцыяў, аўтараў і тэкстаў, якія прысвечаны даследаванням пераходных грамадстваў?**

— Некаторыя з найбольш важных працаў «транзіталагічнага» накірунку былі ўзгаданыя мною вышэй. Я, напэўна, дадаў бы яшчэ да іх манаграфію Хуана Лінца і Альфрэда Стэпана «Праблемы дэмакратычнага транзіту і кансалідацыі» (1996)[5]. Але калі казаць пра вывучэнне працэсаў змены рэжымаў па-за межамі «транзіталогіі», то спіс атрымаецца значна больш вялікім і зойме не адну старонку — дастаткова прыгадаць імёны ад Маркса, Таквіля, Вебера і Шміта да Барынгтана Мура, Даля, Ліпсэта, Ракана і Ванханэна.

**— Назавіце найбольш значныя даследчыцкія цэнтры, друкаваныя выданні?**

— Найбольш значныя цэнтры і выданні ў «транзіталогіі» супадаюць з найбольш значнымі цэнтрамі і выданнямі палітычнай навукі ўвогуле — нейкай асаблівай спецыфікі тут няма. У справе вывучэння праблемаў зменаў рэжымаў я б вылучыў у Злучаных Штатах Гарвардскі, Стэнфардскі, Ельскі, Мічыганскі універсітэты, а таксама Каліфарнійскі універсітэт (Берклі), Універсітэт Нотр-Дам, Тэхаскі універсітэт (Осцін) і некалькі think-tanks, такія як Фундацыя Карнэгі за міжнародны мір і Нацыянальная фундацыя ў падтрымку дэмакратыі. У Еўропе

---

[3] Samuel P. Huntington “The Third Wave: Democratization on the Late Twentieth Century”.

[4] Adam Przeworski. “Democracy and the Market: Political and Economic Reforms in Eastern Europe and Latin America (Studies in Rationality and Social Change)” (Cambridge University Press, 1991).

[5] Juan Linz and Alfred Stepan “Problems of Democratic Transition and Consolidation” (Johns Hopkins University Press, 1996).

трэба адзначыць, перш за ўсё, Еўрапейскі універсітэт у Фларэнцыі, Лонданскую школу эканамічных і палітычных навук, Оксфардскі універсітэт.

Сярод перыядычных выданняў найбольшая ўвага гэтай праблематыцы надавалася на старонках амерыканскіх «Journal of Democracy», «World Politics», «Comparative Politics», а таксама арыентаваных на даследаванне Усходняй Еўропы і постсавецкіх краінаў «East European Politics and Societies», «Post-Soviet Affairs». У Еўропе трэба адзначыць часопісы «Democratization», «Europe-Asia Studies» і шэраг іншых. Але ўсё ж такі праблематыку змены рэжымаў не абыходзілі ўвагай ніякія сур'ёзныя цэнтры і выданні.

**— Як Вы ацэньваеце дастаткова папулярную тэзу пра «канец транзіталогіі», звязаны з вычарпанасцю ейнай эфектыўнасці ў навукова-даследчыцкім плане?**

— Увогуле я згодны з думкай Карозэрса пра «канец транзіталогіі» ў тым выглядзе, у якім яна існавала на пачатку 1990-х гг. Але ўласна вывучэнне працэсаў змены рэжымаў не з'яўляецца вычарпанай тэмай, папросту яе аналіз патрабуе іншых падыходаў.

**— Сёння чарговы раз кажуць пра тое, што «свядомы сінтэз аўтарытарызму і дэмакратыі з'яўляецца аптымальным у сучасным грамадстве», пра тое, што «місіянерскае пашырэнне дэмакратыі з'яўляецца крыніцай і таталітарных тэндэнцыяў», і нават тэрарызму; укараняюцца тэрміны «неліберальная», «гібрыдная», «кантраляваная» дэмакратыя. Ці сталі б Вы пярэчыць падобным тэзам? Калі так, то якія могуць быць аргументы для абвяржэння?**

— Размовы такога кшталту адбываюцца і ў Расіі, і, мяркубчы па ўсім, у Беларусі, а таксама ў шэрагу краінаў «трэцяга свету». Але, як мне падаецца, яны, хутчэй за ўсё, служаць завесай, якая павінна прыхаваць адсутнасць рэальнай дэмакратыі ў гэтых краінах, апраўдаць прэтэнзіі груповак, што кіруюць у гэтых краінах, на ўладу ў адсутнасці палітычнай канкурэнцыі. На самой справе ёсць адзіны неад'емны крытэр дэмакратыі: гэта рэжым, дзе кіраўнічыя партыі могуць страціць уладу ў выніку паразы на выбарах. Калі гэтая ўмова не выконваецца, то «сінтэз аўтарытарызму і дэмакратыі» альбо «кантраляваная» дэмакратыя нагадваюць футбольны матч з загадзя вядомым выніковым лікам, калі суддзя прызначае пенальці толькі ў адныя вароты незалежна ад таго, парушыла каманда правілы альбо не. У тым жа самым шэрагу і енкі з нагоды быццам бы пагрозы «місіянерскага пашырэння дэмакратыі» — яны зыходзяць ад тых, хто пры дэмакратыі рызыкуе страціць уладу і таму імкнецца любымі сродкамі захаваць сваю манаполію на ўладу.

**— Ці магчымая трансфармацыя краінаў, па тэрміналогіі М. Касалапава, «дэмакратычнай арыентацыі», у сапраўдныя ліберальныя дэмакратыі? Якія крытэры гэткай трансфармацыі?**

— Гэткая трансфармацыя магчымая, больш за тое, яна адбываецца ў шэрагу краінаў Усходняй Еўропы, але не ў большасці краінаў былога Савецкага Саюза. Дастаткова назваць не толькі краіны, якія далучыліся да Еўрапейскага Саюза, але і Румынію, і Сербію. Мінімалісцкім крытэрам тут з'яўляецца прызнанне дэмакратычнага рэжыму ў якасці «адзінай магчымай гульні» («the only game in town») усімі найбольш значнымі палітычнымі сіламі і адсутнасць у гэтых краінах сілаў, якія ў стане дамагчыся адмовы ад дэмакратыі.

**— Як Вы ставіцеся да сцвярджэння некаторых даследчыкаў, такіх як А. Мельвіль, што на постсавецкай прасторы логіка рэжымных зменаў скончаная, і зараз для даследчыкаў больш актуальным з'яўляецца пытанне класіфікацыі новых рэжымаў? Якія крытэры могуць быць пакладзеныя ў падмурак гэткай класіфікацыі?**

— Я згодны з тым, што змены рэжымаў у постсавецкіх краінах ужо скончаныя, хоць новыя рэжымы яшчэ пакуль далёкія ад кансалідацыі. Крытэры класіфікацыі новых тыпаў рэжымаў патрабуюць удакладнення яшчэ і з той прычыны, што гэтыя рэжымы не з'яўляюцца нейкімі спецыфічнымі ў дачыненні да постсавецкіх краінаў, падобнага тыпу рэжымы ёсць і ў Афрыцы, і ў некаторых краінах Лацінскай Амерыкі. Акрамя канкурэнтнасці выбараў (наяўнасці альбо адсутнасці рэальнай магчымасці страты ўлады інкумбэнтамі з-за паразы на выбарах), я б яшчэ звярнуў увагу на такія паказчыкі, як тып пануючых палітычных інстытуцыяў (фармальныя і/альбо нефармальныя) і элітная структура (ступень інтэграцыі і дыферэнцыяцыі элітаў).

**— Ці можна разглядаць глабалізацыю і дэмакратызацыю як сінхронныя працэсы?**

— Мяркую, што, нягледзячы на тое, што гэтыя працэсы адбываюцца аднachасова, палягаюць яны ў розных пласкасцях. Досвед Кітая дэманструе, што магчыма быць у авангардзе глабалізацыі па-за сувяззю з дэмакратызацыяй, у той час як працэсы дэмакратызацыі ў Заходняй Еўропе ў XIX–XX стагоддзях адбываліся задоўга да глабалізацыі.

***Пытанні задавалі***
*Ніна Антановіч, Андрэй Казакевіч, Ірына Суздалева*